**“Кніжная спадчына Францыска Скарыны ў свеце: улік і бібліяграфічнае апісанне” (2016–2017 гг.)**

Тэма рэгістравалася ў БелІСА і выконвалася як навуковы праект. Францыск Скарына – выдатны дзеяч беларускай культуры эпохі Адраджэння. Даследаванне яго кніг з’яўляецца важным кірункам у вывучэнні духоўнай і культурнай спадчыны беларускага народа. Мэта праекта – выяўленне, улік і навуковая апрацоўка кніжнай спадчыны Францыска Скарыны. Вынікам работы стаў паэкзэмплярны ўлік кніжнай спадчыны беларускага першадрукара, што захавалася ў свеце: у Расіі – 350 кніг, Украіне – 47, Польшчы – 36, Беларусі – 28, Славеніі – 19, Даніі – 18, Германіі – 11, Вялікабрытаніі – 10, Літве – 2, Чэхіі – 2. Усяго – 523 кнігі. У Беларусі знаходзіцца 10 друкаваных кніг Старога Запавету ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і 18 выданняў “Малой падарожнай кніжкі” ў карпаратыўнай калекцыі Белгазпрамбанка.